# Кірыл Залескі прызначаны міністрам сувязі і інфарматызацыі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў рашэнне аб назначэнні Кірыла Залескага міністрам сувязі і інфарматызацыі, паведамляе БЕЛТА.

Кірыл Барысавіч Залескі нарадзіўся ў 1980 годзе ў Мінску.

У 2002 годзе скончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін (па спецыяльнасці «міжнародныя адносіны») Міністэрства замежных спраў Расіі.

У 2002-2008 гадах працаваў трэцім сакратаром, другім сакратаром пасольства Беларусі ў Рэспубліцы Карэя.

У 2008-2011 гадах быў першым сакратаром, саветнікам аддзела Азіі ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі.

У 2011-2016 гадах – саветнік пасольства Беларусі ў Рэспубліцы Карэя.

У 2016-2018 гадах – начальнік аддзела Афрыкі, намеснік начальніка ўпраўлення Афрыкі і Блізкага Усходу МЗС.

2018-2023 гады – начальнік аддзела грамадскай інфармацыі і міжнароднага супрацоўніцтва, намеснік дырэктара дзяржаўнай установы «Адміністрацыя Парка высокіх тэхналогій».

З 2023 года па 3 сакавіка 2025 года – намеснік начальніка дзяржаўнай установы «Сакратарыят Назіральнай рады Парка высокіх тэхналогій».

З 3 сакавіка 2025 года – міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь.

Крыніца і фота:

https://belta.by/president/view/kirill-zalesskij-naznachen-ministrom-svjazi-i-informatizatsii-699754-2025/

Малюнак



**Source URL:**
*https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/kiryl-zaleski-pryznachany-ministram-suvyazi-i-infarmatyzacyi*